***

У Брэсце ў межах мерапрыемстваў, якія ладзяцца з нагоды надання гораду статусу «Культурная сталіца Садружнасці 2019 года», адбылося выязное пасяджэнне Бібліятэчнай асамблеі Еўразіі (БАЕ), арганізатарамі якога выступілі Брэсцкі гарвыканкам сумесна з БАЕ пры падтрымцы Міждзяржаўнага фонду гуманітарнага супрацоўніцтва (МФГС).

У міжнароднай канферэнцыі «Кніга ў фарміраванні інтэлектуальнай культуры народа» бралі ўдзел кіраўнікі нацыянальных бібліятэк краін Садружнасці: Расіі, Азербайджана, Беларусі, Казахстана, Кыргызстана, Малдовы, Таджыкістана і Узбекістана. Асноўная задача канферэнцыі — ацэнка сучаснага стану і перспектыў адзінай інфармацыйнай прасторы ведаў краін Садружнасці, вызначэнне ролі кніжных калекцый у фарміраванні інтэлектуальнай культуры. Напярэдадні 75-гадовага юбілею Перамогі на форуме былі прадстаўлены тэматычныя інфармацыйныя рэсурсы нацыянальных кніжніц пра Вялікую Айчынную вайну.

Акрамя прафесійных зносін, удзельнікі выязнога пасяджэння БАЕ сустрэліся з кіраўніцтвам горада, бралі ўдзел у паэтычнай акцыі «І слова Пушкіна гучыць...» у гонар 220-годдзя з дня нараджэння паэта, усклалі кветкі да вечнага агню мемарыяла «Брэсцкая крэпасць-герой» і інш.